

# Гродзенскі універсітэт

Выдаецца з 1986 года. Выходзіць адзін раз на месяц. Распаўсюджваецца бясплатна

№ 1 (329), 31 студзеня 2005 года, панядзелак

ГАЗЕТА УСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ «ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ»

30 января – День белорусской науки

## НАУЧНЫЕ ШКОЛЫ УНИВЕРСИТЕТА

В последнее воскресенье января в Беларуси отмечается День науки. Науке принадлежит особая роль в развитии общества. Благодаря наблюдательности, пытливости характера исследователей и разработчиков, человечество не осталось в деревянном и каменном веке. Оно достигло современного уровня развития цивилизации и устремилось вперед в этом ускоренном движении. Обнаружив и «приручив» бронзу, медь, железо, человечество создало новые орудия труда и предметы быта, а после открытия электричества и магнетизма — все то, что сделало возможным стремительный рывок в развитии.

В нашу эпоху влияние науки не ослабевает. Успехи нефтехимии позволили появиться на карте Беларуси городу Новополоцку, успехи геологии и минералогии — городу Солигорску, ядерной энергетики — городам типа Арзамас-16, космической технологии — Плесецку в России и Байконуру в Казахстане. Созданы фабрики и заводы практически во всех крупных и средних городах, основанные на реализации современных достижений в области науки и ее практических приложений. Благодарное человечество стремится увековечить память о лучших ученых, внесших наибольший вклад в развитие науки и техники. Их именами названы теории и функции (теория Эйнштейна, Бора, Герца, уравнение Лапласа, Шредингера, Максвелла, формула Эйлера, Гаусса-Остроградского, геометрия Лобачевского), законы (Джоуля-Ленца, Ома, Гука, Кулона, Гей-Люссака и др.), постоянные (Планка, Больцмана, Пуассона), единицы физических величин (Паскаль, Ампер, Кельвин, Джоуль, Ватт, Ньютон и т.д.). Перечень этот можно продолжать очень долго. Именами выдающихся исследователей и организаторов науки названы университеты, научно-исследовательские институты и лаборатории, улицы и проспекты городов, в том числе в Беларуси.

Понимая важность науки и ее практических приложений, органы государственного управления оказывают всемерную поддержку научной и научно-инновационной деятельности.

Под координацией Национальной академии наук Беларуси, Государственного комитета по науке и технологиям, Белорусского республиканского фонда фундаментальных исследований практически все министерства и ведомства организовывают выполнение исследований и разработок по наиболее перспективным для нашей страны направлениям. В частности, в

*Продолжение на стр. 2*



***Группа студентов Гродненского государственного университета имени Янки Купалы по приглашению депутата Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь А.Н.Буровой (на снимке в центре) побывала в Минске. Материал о поездке читайте на 7-й стр.***

**За высокія дасягненні** ў галіне культуры і мастацтва прэмія імя А.І.Дубко Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта за 2004 год прысуджана мастацкаму кіраўніку і дырэктару Гродзенскай капэлы, загадчыку кафедры спецыяльнага музычнага інструмента Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы дацэнту Уладзіміру Мікалаевічу Борматаву. Шчыра віншуем Уладзіміра Мікалаевіча і жадаем далейшых творчых поспехаў!

## ВІНШУЕМ ЮБІЛЯРАЎ

**Рэктарат, прафкам, Савет ветэранаў віншуюць з юбілеем і жадаюць моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту, поспехаў юбілярам. Нагадваем, калі і каго можна павіншаваць.**

❋5 лютага — **Якалцэвіча Люцыяна Казіміравіча**, вартаўніка базы адпачынку «Пагараны».

❋11 лютага — **Іванова Яўгенія Яўгеньевіча**, дацэнта кафедры тэарэтычнай фізікі фізіка-тэхнічнага факультэта.

❋15 лютага — **Саўваву Раісу Мікалаеўну**, старшага выкладчыка кафедры англійскай філалогіі аддзялення рамана-германскай філалогіі філалагічнага факультэта.

❋20 лютага — **Вавунікяна Юрыя Мікіртычавіча**, дацэнта кафедры тэорыі функцый, функцыянальнага аналізу, верагоднасцей і прыкладной матэматыкі матэматычнага факультэта.

❋22 лютага — **Вронка Фелікса Феліксавіча**, намесніка начальніка вучэбна-метадычнага ўпраўлення.

❋22 лютага — **Ярмусіка Эдмунда Станіслававіча**, старшага навуковага супрацоўніка навукова-даследчай лабараторыі «Рэгіянальная культура».

❋22 лютага — **Мельнічонак Тэрэсу Уладзіславаўну**, ветэрана працы.

❋25 лютага — **Якаўлеву Тамару Афанасьеўну**, пакаёўку інтэрната для замежных студэнтаў «Амега».

❋28 лютага — **Белавусаву Алену Васільеўну**, старшага выкладчыка кафедры філасофіі аб'яднання кафедраў сацыяльна-гуманітарных навук.

# НАУЧНЫЕ ШКОЛЫ УНИВЕРСИТЕТА

*Продолжение. Начало на 1 стр.*

Гродненском государственном университете имени Янки Купалы научные исследования и разработки в 2004 году проводились по 113 темам со значительным объемом бюджетного финансирования, а также по 11 хозяйственным договорам. В 2004 году в университете 622 преподавателя занимались научно-исследовательской работой, из них 46 докторов наук, 260 кандидатов наук.

Сложился и успешно функционирует ряд научно-педагогических школ, возглавляемых авторитетными лидерами и признанными в научных кругах учеными, результаты исследований которых широко внедряются в народное хозяйство и учебный процесс университета и колледжей. Наиболее яркий пример таких школ представляет научно-педагогическая школа криминалистики, возглавляемая доктором юридических наук, заведующим кафедрой уголовного права и криминалистики, членом-корреспондентом Академии образования Республики Беларусь, профессором Зориным Г.А. Основным научным направлением этой школы является разработка новых методов транснациональной криминалистики и международного уголовного процесса в борьбе с международной уголовной преступностью. Под его руководством защищено более десятка кандидатских диссертаций, а один из аспирантов работает деканом юридического факультета университета в г. Ухань (Китай).

Научно-педагогическую школу в области теории государства и права возглавляет заведующий кафедрой профессор Сильченко Н.В. Результаты его исследований легли в основу более десятка монографий, стали основой для учебных и учебно-методических пособий. Под руководством профессора Сильченко успешно функционирует Совет по защите кандидатских диссертаций по специальности К.02.14.01.

Благодаря усилиям докторов физико-математических наук профессоров Мартынова И.П. и Минюка С.А., а также при непосредственном участии профессора Горбузова В.Н. в университете существует и успешно развивается научно-педагогическая школа по дифференциальным уравнениям. За последние годы ими в соавторстве с преподавателями математического факультета опубликован ряд монографий и учебников, учебных пособий и более 200 научных статей и тезисов. Под руководством профессора Мартынова И.П. успешно функционирует Совет по защите кандидатских диссертаций К.02.14.02.

Научно-педагогическая школа по молекулярной спектроскопии возглавляется доктором физико-математических наук, профессором Маскевичем С.А. О ее широком международном признании свидетельствует и тот факт, что при совместном выполнении международных программ и грантов она сотрудничает с ведущими центрами в области молекулярной спектроскопии Франции, Греции, Италии, Англии и Австрии.

Следует отметить успешно развивающиеся направления, связанные с разработками в областях наноматериалов и нанотехнологий, атомной спектроскопии и спектроскопии высокого разрешения, созданием и клиническими исследованиями противораковых лекарственных препаратов; радиофизики и электроники, истории Беларуси, белорусского словообразования, фундаментальных проблем общей теории государства и права, защиты социальных, трудовых, аграрных, земельных и природоресурсных прав граждан. Находятся в стадии корректировки перспектив и направлений научные школы в области культурологии и социально-перцетивной регуляции педагогической деятельности.

Исследования ведутся по широкому спектру актуальных проблем как в составе уже сформировавшихся школ, так и отдельными исследователями и группами.

Результаты обобщаются в диссертациях и монографиях, учебниках и учебных пособиях, статьях в научных журналах и докладах на конференциях. Они используются также в учебном процессе, в экономике и социальной сфере. Так, в 2004 году защищено 2 докторских (Жук И.В., Данилович Н.А.) и 17 кандидатских диссертаций, издано свыше 30 монографий, 4 учебника и 72 учебных пособия.

Приятно отметить, что у нас проводят исследования не только сотрудники ГрГУ им. Я. Купалы, но также сотрудники научных центров Польши, Австрии, России и многих других стран, что служит показателем высокого уровня научного потенциала нашего университета.

В связи с Днем науки хочу поздравить всех наших докторов и кандидатов наук, аспирантов и соискателей, преподавателей и студентов и пожелать им успехов в этом трудном, но интересном деле — развитии новых идей, новых концепций, новых материалов, приборов и технологий.

**В.Г.БАРСУКОВ,**
**профессор, проректор по научной работе.**

Наука

# СОВМЕСТНОЕ ЗАСЕДАНИЕ СЕМИНАРОВ

Продолжается традиция проведения совместных заседаний семинаров «Актуальные проблемы современного социокультурного знания» и «Матэматычная адукацыя». На последнем из них с сообщением «Лики глобализма в перспективе восточнославянской духовной традиции» выступила кандидат философских наук С.З. Семерник.

Снежана Здиславовна провела развёрнутый анализ процесса глобализации, протекающего в современном социуме. Она показала, что порождаемые им ценности противоположны духовным устремлениям, свойственным человечеству на протяжении многотысячелетней истории его существования.

Перевёрнутость сознания и полный контроль над личностью — те перспективы, которые глобализм готовит мировому сообществу. В результате, по мнению докладчика, мир может оказаться в духовном Зазеркалье: по другую сторону от объективных законов, традиционных норм и культурных смыслов. Чтобы изменить такой сценарий развития общества, необходимо обратиться к духовным истокам восточнославянской цивилизации и осветить ими происходящие в обществе процессы.

Аргументированное и эмоциональное выступление С.З. Семерник было выслушано с большим вниманием. Докладчик ответила на многочисленные вопросы слушателей, привела убедительные примеры, обосновывающие её позицию. Было решено продолжить практику совместного обсуждения научных проблем естественниками и гуманитариями.

**О.А.КОЧЕТКОВА,**
**секретарь семинара «Матэматычная адукацыя».**

# НЕ ТОЛЬКО О ЛОГИСТИКЕ

Заместитель декана по научной работе факультета экономики и управления ГрГУ кандидат экономических наук М.Е.Карпицкая и студенты А.Калита, А.Авдейчик, С.Холяво по приглашению Студенческого научного общества посетили Щецинский университет. Целью поездки было участие в конференции «Социально-экономические проблемы развития Еврорегионов», в частности, Еврорегиона Померания, а также ознакомление с опытом организации научной работы студентов в данном вузе.

Особенно нас интересовала такая работа на факультете управления и экономики услуг. Студенты этого факультета проводят исследования по хоздоговорным темам, занимаются проведением конференций, семинаров, ведут самостоятельную финансово-хозяйственную деятельность. Поэтому своей задачей мы ставили изучить накопленный опыт и реализовать его в рамках действующего научного общества факультета экономики и управления Гродненского государственного университета.

Участниками конференции были представители не только польских вузов, но и ближнего и дальнего зарубежья — Венгрии, Германии, Беларуси, Литвы, Латвии, Украины, России. На конференции обсуждались проблемы маркетинга, менеджмента и логистики, развития экономики с учетом происходящих интеграционных процессов в Евросоюзе. Доклады представителей Беларуси вызвали горячую заинтересованность. После каждого выступления поступало много вопросов, что свидетельствует об интересе к экономическим процессам, происходящим в нашей республике. Дискуссию облегчало знание польского языка всеми участниками гродненской делегации.

Наша делегация была принята деканом факультета управления и экономики услуг Щецинского университета. Во время встречи обсуждались перспективы взаимного сотрудничества, проект договора о котором был подготовлен М.Е.Карпицкой. Мы надеемся, что участниками традиционной конференции «НИРС ФЭУ 2005» станут и представители студенческих научных обществ из других вузов.

Второй день конференции проходил на территории Швеции. Небольшой портовый город Иштад встретил нас ярким солнцем. Узкие улочки, дома в готическом стиле — все это оставило незабываемые впечатления. Казалось, что время в этом городке остановилось, и вот-вот появятся на улицах старинные экипажи с дамами в пышных нарядах... Но мечтать некогда, мы продолжали работу. Хотелось бы пожелать всем студентам провести свои студенческие годы как можно более активно.

**Станислав ХОЛЯВО,**
**студент 4 курса факультета экономики и управления.**

# ДРУЖИНА

**Они — гроза студентов, любящих курить на крыльце учебного корпуса, они контролируют, чтобы на культурные мероприятия не проскользнул «заяц», благодаря этим людям наш университетский город может спать спокойно. Они — это Добровольная студенческая дружина по охране внутреннего порядка Гродненского государственного университета имени Янки Купалы.**

Раньше в университете действовал оперотряд. Весной прошлого года Студенческий совет ГрГУ выступил с инициативой создать Дружину. По поводу юридического статуса ее было много споров. Но вот приказом ректора ГрГУ С.А.Маскевича от 8 октября 2004 года утверждено «Положение о добровольной студенческой дружине по охране внутреннего порядка УО «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы», зарегистрировано в горисполкоме. Более подробно о деятельности Дружины мы попросили рассказать ее командира, студента пятого курса юридического факультета **Дмитрия Юркевича.**

**- Дмитрий, расскажите, как все начиналось?**

- В 2002 году я занимался в секции славянских единоборств, которая действует при нашем университете. Однажды на тренировку пришел Юрий Сигиневич, чтобы отобрать ребят для обеспечения порядка при проведении КВНа. Постепенно нас стали привлекать к охране порядка на других массовых мероприятиях не только в университете, но и в городе. Так я попал в состав оперотряда.



На снимке: члены дружины Дмитрий Юркевич (командир), Полина Раевская, Сергей Черняк (юрфак), Николай Лысюк (матфак), Надежда Ефименко (факультет психологии).

**- Как можно стать членом Дружины?**

- Для начала надо подать заявление в Студенческий совет. Оно рассматривается комиссией в составе начальника отдела по воспитательной работе со студентами, председателя Студсовета, тренера секции по физической подготовке дружинников. Условия — возраст не моложе 18 лет, деловые, моральные качества и состояние здоровья должны отвечать предъявляемым требованиям.

**- Сколько человек в настоящее время входит в состав Дружины? Есть ли среди них девушки?**

- Всего у нас 36 человек, в том числе шесть девушек.

**- Что входит в их обязанности?**

- Основной задачей является охрана внутреннего порядка в учебных корпусах, общежитиях и вообще на всей территории университета. Главные же функции — это поддержание порядка, охрана жизни и здоровья студентов и их собственности; участие в деятельности по профилактике и пресечению правонарушений, предупреждение курения в неустановленных местах; обеспечение противопожарной безопасности и многое другое.



На снимке: Дмитрий Юркевич

Свою деятельность Дружина осуществляет, неся патрулирования, выставляя посты на территории университета и присутствуя на мероприятиях.

**- Скажите, а были случаи, когда нарушители не хотели выполнять ваши требования?**

- Были, конечно, но очень редко. В конце концов мы находили подходящие доводы, чтобы человек понял, что поступает неправильно.

**- А преподаватели и сотрудники?**

- Требования по соблюдению норм поведения распространяются и на них. Но с преподавателями никогда проблем не возникало.

**- Существуют ли для членов Дружины какие-либо льготы?**

- Лично я считаю, что человек должен вступать в нашу организацию не из-за выгод. Ну а поощрения предусмотрены такие: администрация университета может предоставить льготы по оплате за обучение, премировать, ходатайствовать о трудоустройстве в правоохранительные органы, выдавать характеристики и рекомендации по месту будущей работы. Объявление о поощрении дружинников должно проводиться в торжественной обстановке на общих собраниях и конференциях студентов.

**- Вот Вы, Дмитрий, командир такой серьезной организации, а это учебе и личной жизни не мешает?**

- Что касается учебы, то преподаватели к моей работе в Дружине относятся по-разному: одни положительно, другие — наоборот. И тогда возникают некоторые проблемы. А личной жизни не мешает.

**- Расскажите какой-нибудь интересный случай.**

- Случай? Происходило много всего, и не очень приятного. Ну, например, была такая ситуация. Проходила международная конференция. На таком важном мероприятии нежелательно, чтобы кто-нибудь выходил, мешая остальным. Вдруг один парень встает и решительно направляется к выходу. Мы его останавливаем и вежливо интересуемся, куда он идет. Молодой человек отвечает, что в туалет. Такая уловка пользуется большой популярностью, поэтому мы долго не хотели его выпускать. В конце бедняга оставил нам свой студенческий билет в залог того, что обязательно вернется.

А еще дружинники являются постоянным «предметом» шуток кэвээнщиков. Вот одна из них: на сцену приходит записка от членов Дружины: «Вот вы все шутите, шутите, а когда мы домой пойдем?»

А если серьезно, то абсолютное большинство студентов согласны с тем, что Дружина в университете действует.

Как видим, быть дружинником — дело не из легких. Поэтому мы поинтересовались, как в ней чувствуют себя прекрасные представительницы рода человеческого? Хотя женщины в милиции, охране, политике уже давно не новость, мы все же решили полюбопытствовать у девушек, почему и зачем они пришли в Дружину? От лица всех дружинниц нам ответила студентка юридического факультета **Полина Раевская.**

- А что здесь необычного? — говорит Полина. — Правда, попасть сюда было не очень легко. Долго упрашивали тренера, чтобы разрешил вступить в Дружину, но своего добились. Работаем, как все. С нарушителями проблем даже меньше, чем у парней — ну как не послушать красивую девушку?! Вот, например, у нас одна девушка, Алеся Кебикова с факультета психологии, третье место по у-шу на чемпионате мира заняла. Да если что, мы за себя постоять сможем.

**Интервью подготовили Татьяна ВЕРУШ, Екатерина КЛЕЦЕВИЧ, Марина МАЦКЕВИЧ, студентки 3 курса филологического факультета.**

## Думкі аб выкладанні і выхаванні



*Вольга Барысаўна Цэхан працуе ў Гродзенскім універсітэце з 1992 года, спачатку асістэнтам, старшым выкладчыкам кафедр прыкладной матэматыкі матэматычнага і эканамічнага факультэтаў, зараз — дацэнтам кафедры ТФФАіПМ матэматычнага факультэта.*

*Асноўная тэма яе навуковых даследаванняў — матэматычная тэорыя кіравання. У 1993 годзе абараніла ў Беларускім дзяржаўным універсітэце дысертацыю «Метады даследавання кіруемасці і назіраемасці нестацыянарных сінгулярна ўзбураных сістэм» на саісканне ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук. Апублікавала шэраг навуковых артыкулаў у вядомых часопісах — «Весці Акадэміі навук Беларусі», «Известия Российской Академии наук», «Прикладная математика и механика», «Дифференциальные уравнения», «System Science» і іншых.*

*Дысцыпліны, якія выкладала В.Б.Цэхан, адносяцца, у асноўным, да прыкладнога накірунку матэматыкі — «Даследаванне аперацый», «Дыскрэтнае праграмаванне», «Метады аптымізацыі», «Аўтаматызаваныя сістэмы кіравання». У цяперашні час вядзе курсы «Матрычны аналіз», «Эканоміка-матэматычныя метады», спецкурс «Матэматычныя мадэлі і метады рашэння задач аптымальнага планавання і кіравання» для студэнтаў матэматычнага факультэта.*

*Вольга Барысаўна прыняла прапанову ўдзельнічаць у праекце «Педагогі Гродзенскага універсітэта» і згадзілася адказаць на шэраг пытанняў. Поўны тэкст яе інтэрв'ю падрыхтаваны да апублікавання ў выніковым зборніку праекта Наталляй Рыгораўнай Васільевай. Скарочаны яго варыянт друкуецца сёння ў газеце «Гродзенскі універсітэт». Запрашаем далучыцца да праекта калег, якія жадаюць падзяліцца разважаннямі аб праблемах адукацыі і выхавання. Правілы для аўтараў можна знайсці ў газеце «Гродзенскі універсітэт» (№ 1 (317) ад 29 студзеня 2004 года). Тэлефон для даведак — 44-50-60 (Вучэбна-метадычнае упраўленне ГрДУ).*

***Ю.ЗАЛАТУХІН,***
***старшыня камісіі па вывучэнню і ўкараненню перадавога вопыту і павышэнню педагагічнага майстэрства Навукова-метадычнага савета ГрДУ.***

# В.Б.Цэхан: «Зыходжу з прынцыпу «прэзумпцыі выдатніка»

**- Вольга Барысаўна, раскажыце, калі ласка, аб пачатку Вашага жыццёвага шляху, абставінах дзіцячых і юнацкіх гадоў, якія паўплывалі на Ваш выбар прафесіі.**

- Нарадзілася я ў 1965 годзе ў горадзе Вілейка Мінскай вобласці. Матуля мая, Яўгенія Сцяпанаўна Манцэвіч, — настаўніца матэматыкі, тата, — Барыс Флоравіч Манцэвіч, — журналіст.

У 1970 годзе мае бацькі, старэйшы брат Алесь і я пераехалі ў горад Беразіно Мінскай вобласці. Там я скончыла звычайную сярэднюю школу і музычную — па класе фартэпіяна. Напэўна, як і многія дзеці, калі хадзіла ў дзіцячы садок, марыла працаваць выхавацелькай. Але добра памятаю, што школьніцай вяла гаворку аб тым, каб стаць настаўніцай. Мне сапраўды здавалася, што ў мяне гэта атрымаецца, падабалася разабрацца ў чым-небудзь, а потым растлумачыць іншым. Цікавілася педагагічнай літаратурай. Але мая матуля, ведаючы, які цяжкі настаўніцкі хлеб, адгаворвала мяне.

Калі скончыла музычную школу, настаўніца прапанавала паступаць у музычнае вучылішча. І я нават рыхтавалася. Але пад той час я ўжо зрабіла спробу паступіць ў завочную фізіка-матэматычную школу пры БДУ і вагалася, што ўсё ж такі выбраць. Урэшце разважыла: зрабіўшыся музыкантам, я наўрад ці буду займацца матэматыкай, а вось калі буду матэматыкам, пакінуць з сабой музыку змагу.

Першы раз паспрабавала сябе ў якасці настаўніка падчас дзён навукі ў летняй фізіка-матэматычнай школе ў лагеры «Зубраня». Разам з сябрам «фізматыкам» правялі ўрок фізікі ў малышоў.

**- У якой навучальнай установе Вы атрымалі профільную адукацыю?**

- У 1983 годзе стала студэнткай факультэта прыкладной матэматыкі БДУ. На выбар значна паўплывала сяброўства з «фізматыкамі» з «Зубраня». А яшчэ мне імпанавала прыкладная матэматыка. Вельмі хацелася навучыцца ўжываць матэматыку для рэальных спраў. Я ўяўляла сябе інжынерам, абавязкова на якім-небудзь прадпрыемстве.

**- Вольга Барысаўна, як складвалася Ваша педагагічная дзейнасць у ВНУ?**

- Перад размеркаваннем пасля заканчэння аспірантуры думала: «Не ведаю, куды хачу, але добра ведаю, чаго не хачу: быць выкладчыкам ВНУ». Можа, таму, што ў нас усе выкладчыкі былі мужчыны, мне здавалася, што жанчына-выкладчык — гэта не вельмі цікава. Я і зараз лічу, што жанчыне цяжэй падтрымліваць выкладчыцкую форму.

Спецыяльнай педагагічнай падрыхтоўкі ў мяне няма. Уся педагагічная праца праходзіць у ГрДУ. І хаця фармальна мой педагагічны стаж складае 13 год, фактычна (з-за нараджэння двух дзетак) я працавала значна менш. За гэты час, аднак, давялося выкладаць розныя дысцыпліны, працаваць на факультэце эканомікі і кіравання і матэматычным факультэце ГрДУ. Трэба сказаць, што ўсе дысцыпліны, якія я выкладала, ляжаць у рэчышчы маіх навуковых інтарэсаў: тэорыі сістэм, тэорыі кіравання.

Цікава, што распрацаваны мной апошнім часам курс «Матрычны аналіз» мае непасрэднае дачыненне да ўсіх кірункаў маіх навуковых і прыкладных інтарэсаў. Матрычны інструментарый — вельмі зручны для многіх прымяненняў: як у матэматыцы, так і ў сумежных дысцыплінах. Даследаванні ў гэтай галіне вядуцца зараз ва ўсім свеце. Таму цікава было распрацоўваць гэты курс і падрыхтоўваць вучэбны дапаможнік да яго. У планах — падрыхтаваць цэлы метадычны комплекс у падтрымку курса.

**- Якімі галоўнымі якасцямі, на Ваш погляд, павінен валодаць выкладчык вышэйшай школы?**

- Лічу, што выкладчык павінен:

добра ведаць свой прадмет (у дзесяць разоў глыбей і шырэй, чым выкладаецца студэнтам);

вучыць студэнтаў самастойна здабываць новыя веды, даваць ім разуменне працэсу стварэння новых дасягненняў;

весці навукова-даследчую работу: каб не выходзіць з разумення цяжкасці працэсу пазнання і таму лепш разумець студэнтаў і дапамагаць ім ў пазнавальнай дзейнасці; каб яшчэ і яшчэ раз мець магчымасць пацвердзіць сабе і сваім вучням узаемасувязь і ўзаемаўздзеянне розных галін навукі, розных бакоў існасці; каб заўсёды самому быць у курсе навінаў навукі і накіроўваць сваіх вучняў на даследніцтва;

валодаць метадычнымі прыёмамі выкладання матэрыялу, працаваць над іх удасканаленнем;

быць карэктным у адносінах, у тым ліку, да студэнтаў;

і проста быць цікавым чалавекам.

Усё гэта вельмі цяжка, асабліва жанчыне. Ды і здатнасці да такой справы ёсць не ў кожнага.

**- Ці маеце Вы сваё, калі можна так сказаць, педагагічнае крэда?**

- Рыхтуючыся да заняткаў, праводзячы іспыты, я зыходжу, так бы мовіць, з прынцыпу «прэзумпцыі выдатніка». Лічу, што кожны студэнт зацікаўлены ў тым, каб атрымаць добрыя прафесійныя веды. А я павінна дапамагчы яму ў гэтым. Таму матэрыял павінен быць сучасны, цікавы, патрэбны, абгрунтавана выкладзены. Тлумачыць яго трэба так, каб зразумела было не толькі выкладчыку. Калі падчас лекцыі ніхто нічога не зразумеў — гэта проста марнатраўства часу. Нейкі вялікі вучоны і педагог (на жаль, не памятаю хто) казаў калегам, ідучы на іспыт: «Я іду шукаць выдатнікаў, а не двоечнікаў». Мне такая пазіцыя вельмі імпануе.

**- Якое значэнне Вы прыдаеце выхаваўчаму кірунку дзейнасці універсітэта, якім павінен быць змест выхаваўчай работы?**

- Безумоўна, працэс выхавання займае значнае месца ў дзейнасці ВНУ. Чалавек мяняецца ўсё сваё жыццё. А ў юнацкім узросце (а гэта асноўны кантынгент студэнтаў) гэтыя змяненні больш грунтоўныя, яны істотна ўплываюць на далейшае развіццё асобы, а тым самым, і грамадства. Аднак мне здаецца, што няма патрэбы наладжваць нейкія спецыяльныя «выхаваўчыя» мерапрыемствы. Педагог выхоўвае ўсімі сваімі дзеяннямі. І тым, як ён рыхтуецца да заняткаў і праводзіць іх, і тым, як паводзіць сябе, у прыватнасці, у адносінах да калег, студэнтаў, і тым, як удзельнічае ў жыцці універсітэта, грамадства. Вопытны педагог заўсёды знойдзе час і месца, каб і ў працэсе заняткаў выказаць свае адносіны да тых ці іншых з'яў, і такім чынам паўплываць на студэнтаў.

**- Якія тэндэнцыі ў развіцці сістэмы адукацыі Вам падабаюцца, якія выклікаюць апасенне?**

- Многія перабудовы у сістэме адукацыі мяне насцярожваюць. Сумненне выклікае, так бы мовіць, «глабалізацыя» вышэйшай адукацыі. Пад гэтым я разумею пашырэнне даступнасці вышэйшай адукацыі ў сувязі з увядзеннем платных і іншых формаў навучання. Зразумела, ВНУ, якім бракуе дзяржаўнай падтрымкі, вымушаны шукаць сродкі для існавання і, у прыватнасці, зацікаўлены ў павелічэнні колькасці платных студэнтаў. Таму падчас студэнтамі становяцца далёка не лепшыя. На мой погляд, усё гэта пагражае наступным: у сітуацыі адсутнасці дыферэнцыяцыі навучання зніжаецца агульны ўзровень студэнцкай аўдыторыі і, як вынік, узровень навучання; вымушаныя аплачваць адукацыю са сваёй кішэні студэнты часта паралельна з вучобай працуюць, што замінае ім атрымліваць грунтоўныя веды з-за нястачы часу.

А між тым паўстае пытанне: ці патрэбна грамадству столькі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй? Значная частка атрымаўшых дыплом так і не знаходзіць сабе прымянення менавіта як высокаадукаваныя спецыялісты, тым больш па адпаведнай спецыяльнасці. Часам складваецца ўражанне, што ніхто не праводзіць хаця б прыблізны аналіз, колькі і якіх спецыялістаў трэба рыхтаваць. Можа, трэба больш працаваць над праблемай узгодненасці патрабаванняў рынку спецыялістаў і сістэмы іх падрыхтоўкі, распрацоўваць вузкаспецыялізаваныя праграмы «пад канкрэтную фірму»?

